## Гульня ў адходы, альбо як у Слаўгарадзевучаць не смеціць.

На Магілёўшчыне запрацаваў унікальны Цэнтр па энерга- і рэсурсазберажэнні "EcoSlay", дзе дзеці расказваюць, як эканоміць на другаснай сыравіне.

Уявіце сабе пляцоўку з раскіданымі паўсюль пластыкавымі бутэлькамі,




каробкамі з-пад соку, шклянымі слоікамі і... дзяцей, якія не толькі ўсе гэта смецце збіраюць, але і старанна раскладвюць яго па асобных пакетах. Гэта не суботнік, гэта... гульня. Дыректар слаўгарадскай СШ №1 і кіраўнік вышайназванага цэнтра Ігар Кавалёў упэўнены, што такія экалагічныя спаборніцтвы выхоўваюць у падлеткаў культуру абыходжанняз другаснымі рэсурсамі.

Аказваецца, ёсць цэлая навука, якая займаецца вывучэннем разнавіднасцяў смецця і спосабаў яго ўтылізацыі — гарбалогія! Вучоныя падлічылі, што перапрацоўка 2500 шкляных бутэлек эканоміць 650 кілаграмаў пяску, 150 кілаграмаў кальцыніраванай соды і 200 кіло вапняку. Ну а пра тону паперы, якая ратуе 17 дрэў, напэўна, і так усе ведаюць.

У краіне дзейнічае праграма па зборы і перапрацоўцы другаснай сыравіны, а ў Слаўгарадзе вырашылі сур'ёзна заняцца гэтым пытаннем і прапанавалі свой праект "Пляцоўкі другасных рэсурсаў (новы погляд на змяненне адносінаў да праблемы)". Распрацаваў яго мясцовы фонд развіцця сельскіх тэрыторый "Адраджэнне-Агра", які разам зваланцёрамі рэалізуе яго пры фінансавай падтрымцы праграмы малых грантаў Глабальнага экалагічнага фонду. Былі набыты і ўстаноўлены 45 каляровых кантэйнераў для паасобнага збору другаснай сыравіны, вырабляюцца інфармацыйныя шчыты загітацыйнай інфармацыяй.

- Захацелася нагадаць усім, што праблема экалагічнай катастрофы існуе рэальна, а ў нашых сілах не толькі яепрадухіліць, але і стаць багацейшымі, — тлумачыць матыў самой ідэі дырэктар мясцовага фонду "Адраджэнне-Агра" Віталь Варабей. — Праект зроблены з такім разлікам, што ў ім прымаюць удзел усе без выключэння, у тым ліку прадпрыемствы і арганізацыі. На базе першай школы адкрыўся Цэнтр па энерга- і рэсурсазберажэнні, дзе працуюць валанцёры. У Слаўгарадзе і аграгарадках Лапацічы і Лясная з'явілася 15 пляцовак для паасобнага збору смецця.

**Дзеці вучацца сартаваць смецце праз гульню**

У тым, што ўсё гэта робіцца не дзеля галачкі, упэўнілася асабіста. Яшчэ да пачатку апошняй летняй акцыі паспела пагутарыць з камандзірам валанцёраў ВольгайПрывалавайз 11 "А" класа. Дзяўчына шчыра Прызналася, што яна зусім не саромецца ездзіць на сметнікі і расказваць слаўгарадчанам аб паасобным зборы другаснай сыравіны. З адных толькі пластыкавых бутэлек можна зрабіць вялікую колькасць разнастайных прадметаў.

— Сёлета на сырным фэсце, які праходзіў у Слаўгарадзе, мы дэманстравалі ўсё, што атрымліваецца з адпрацаваных рэчаў, — расказвае яна. — У школе на ўроках на працоўным навучанні робім кветкі: і пластыку, сумкі з вінілавых дыскаў, вазачкі для алоўкаў з лазерных дыскаў і пластыкавых коркаў. Людзі здзіўляюцца, а некаторыя нават не вераць, што са смецця можна зрабіць такую прыгажосць.

На акцыю па зборы шкла і пластыку завітала нават украінская сям'я, якая пераехала ў Слаўгарад на пастаяннае месца жыхарства. Валянціна і Генадзь Шахавы з дачкой Аняй і пляменнікам Андрэем Зарубіным прыкацілі на



веласіпедзе мяшок пластыкавых бутэлек.

Аня і Андрай з азартам уключыліся ў тую гульню, якую разам з валанцёрамі праводзіў для дзяцей дырэктаршколы№1 Ігар Кавалёў. "ЗаданнеNo1 — збіраем раскінутыя бутэлькі, — інструктаваў ён каманды. — Браць можна толькі па адной, зразумелі? Кінулі ў вядро і пабеглі за наступнай. Паперу не чапаць. Гатовы?". Страсці з першых хвілін спаборніцтва амаль такія ж, як на футбольным полі.

— Мы вельмі зацікаўлены ў гэтым праекце і актыўна ў ім удзельнічаем, — прызнаецца Ігар Паўлавіч. — Нават пісалі сваю частку па энерга- і рэсурсазберажэнні. Чаму рэалізуем праект праз дзяцей? Дзеці стасуюцца, цікавяцца і захапляюць астатніх, у тым ліку і бацькоў. Калі сын ці дачка зробіць некалькі заўваг старэйшым членам сям'і, тым стане няёмка.

Дарэчы, у апошняй летняй акцыі лепшыя вынікі паказалі Валерыя Лемцюгава, якая сабрала 21 кілаграм пластыку, і васьмікласнік Вадзім Кірыенка з рэкордам у 36 кілаграмаў шкла. Вадзім, напрыклад, каб сабраць такую колькасць другаснай сыравіны, пачысціў разам з сястрой Вікай роў каля гаю!І такія "подзвігі", запэўнілі арганізатары, не выключэнне. Дзеці правялі саначыстку ў падвалах, на вуліцах горада і беразе ракі Сож.

**Будзем лічыць грошы**

Скептыкі скажуць: акцыі і семінары — гэта добра, але праз час хто пра іх успомніць? Таму ў Слаўгарадзе і быў створаны Цэнтр па энерга- і рэсурсазберажэнні. Менавіта на базе яго будуць рэгулярна праходзіць абмены вопытам, трэнінгі, тыя ж самыя семінары і агітацыйныя акцыі. У школе №1 пад яго выдзелены асобньг кабінет, набыты камп'ютары, банерныя дысплеі, спецыяльныя відэапрэзентацыі, энергакалькулятары. Усе гэта — алошнія распрацоўкі Магілёўскага Тэхнапарка, які заключыў з мясцовым фокдам "Адраджэнне-Агра" дамову аб супрацоўнецтве.

— 3 дапамогай энергакалькулятараў па кожнай лямпачцы можна палічыць выдаткі і паглядзець, за колькі гадоў яна акупіцца і ці магчыма гэта, — кажа Ігар Кавалёў. — Ёсць магчымасць даведацца, колькі электраэнергіі за год спажывае пральная машына альбо колькі кілават губляецца, калі мы пакінулі тэлевізар уключаным у разетку на цэлы дзень.

— Цэнтр будзе працаваць на матывацыю таго, каб у насельніцтва прачнулася сумленне і яны самі пачалі паасобнаскладацьдругасныярэсурсы, — падкрэслівае каардынатар праекта Ірына Марціновіч. — Тое, што такое магчыма, мы ўпэўніліся асабіста.

***Нэлі ЗІГУЛЯ***

**Источник:** Родная прырода. — № 10. — С. 16—17.

